*Пралетарыі усіх краін, еднайцеся!*

# ПЕРАМОГА

ОРГАН АНТОПАЛЬСКАГА РК КП(б)Б І ВЫКАНКОМА РАЙСОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ.

№ 48 (62) Нядзеля, 14 кастрычніка 1945 г.

**Набліжаецца 28-я гадавіна Вялікай Кастрычніцкай Соцыялістычнай Рэволюцыі. Працоўныя раёна, паспяховым завяршэннем сельскагаспадарчага года, выкананнем усіх сваіх абавязацельстваў, новымі вытворчымі перамогамі сустрэнем вялікае свята!**

## Своечасова здаць бульбу дзяржаве!

Копка бульбы ў нашым раёне ў асноўным закончана. Пачалася вывазка яе на нарыхтоўчыя пункты. Акцябрскі сельсовет, які стаіць на першым месцы ў раёне па выкананню хлебапаставак, таксама ўжо на 11 кастрычніка здаў дзяржаве бульбы на 46 процантаў. На 43 проценты выканаў план пастаўкі бульбы Галоўчыцкі сельсовет.

Аднак, яшчэ далёка не зразумелі важнай задачы—нарыхтоўку бульбы асобныя сельсоветы. Да прыкладу можна прывесці Гарадзецкі сельсовет. Ён знаходзіцца побач з нарыхтоўчым пунктам, але яшчэ не здаў ніводнага кілограма бульбы. А вот сельсоветы, як Антопальскі, Першамайскі, Худлінскі, якім як рукою падаць да нарыхтоўчых пунктаў, а таксама зусім маюць малы процант выканання.

Кіраўнікам сельскіх советаў, кожнаму селяніну патрэбна добра зразумець усю глыбіню важнасці своечасовай здачы бульбы дзяржаве. Трэба не забываць, што пака яшчэ стаіць нядрэнная пагода, перавозкам спрыяе і дарога. Патрэбна гэты час выкарыстаць для хутчэйшай здачы бульбы дзяржаве. Для вывазкі бульбы на нарыхтоўчыя пункты трэба выкарыстаць усю цягавую сілу, а таксама кароў.

Нарыхтоўчым арганізацыям, у першую чаргу, раённай канторы белплодгародніны, патрэбна наладзіць узорны парадак на нарыхтоўчых пунктах, каб здатчыкі бульбы падоўгу не затрымліваліся ў чарзе.

Бульба—гэта другі хлеб. І нарыхтоўка яе—важнейшая дзяржаўная задача. Узорна выканаць гэту задачу— абавязак кожнага працаўніка вёскі.

## БОЛЬШ ХЛЕБА КРАІНЕ!

### Хлеб у фонд Перамогі

Завяршыўшы здачу хлеба дзяржаве і ў фонд Чырвонай Арміі, сяляне вёскі Хамічыцы, Асіпавіцкага сельсовета, здаюць збожжа ў фонд Перамогі. Селянін Іван Нядзелька, які значна перавыканаў пастаўку збожжа дзяржаве, зараз здаў у фонд Перамогі 47 кілограм хлеба. Іван Сцепанюк мае 6 душ сям'і, 1,76 гектара ворыўнай зямлі, а таксама здаў у фонд Перамогі 42 кілограмы збожжа. Сяляне гэтай вёскі ўжо здалі звыш плана больш тоны хлеба.

—Чым больш дадзім хлеба роднай дзяржаве,—гавораць сяляне,—тым хутчэй будуць залечаны раны, нанесеныя нашай краіне гітлераўскімі разбойнікамі.

**М. Залялеев.**

## Па прыкладу актывістаў

З першых дзён нарыхтоўчай кампаніі актыў Галоўчыцкага сельсовета стаў па-бальшэвіцку ўзначальваць соцыялістычнае спаборніцтва сярод сялян за датэрміновую здачу хлеба дзяржаве. Першымі ў вёсцы Галоўчыцы выканалі свае абавязацельствы перад дзяржавай актывісты сельсовета Андрэй Новік, Якаў Тышко. На сваіх участках яны правялі масава-растлумачальную работу, арганізавалі ўзаімадапамогу па вывазцы збожжа. Дзякуючы такой пастаноўцы работы сяляне іх участкаў першымі ў вёсцы завяршылі здачу збожжа дзяржаве. Зараз ідзе здача хлеба ў фонд Перамогі.

**Ваўрук.**

## ЗВОДКА

**Аб ходзе збожжанарыхтовак дзяржаве і ў фонд Чырвонай Арміі на 12 кастрычніка.**

| №№ п/п | Назва сельсоветаў | Процант выканання |
|---|---|---|
| 1 | Акцябрскі | 95,6 |
| 2 | Худлінскі | 90,5 |
| 3 | Дзеткавіцкі | 90,2 |
| 4 | Першамайскі | 89,8 |
| 5 | Аніскавіцкі | 86,4 |
| 6 | Дзямідавіцкі | 81,9 |
| 7 | Антопальскі | 75,0 |
| 8 | Асіпавіцкі | 74,3 |
| 9 | Заніўеўскі | 73,6 |
| 10 | Галоўчыцкі | 72,4 |
| 11 | Ілаўскі | 65,7 |
| 12 | Каменскі | 64,5 |
| 13 | Гарадзецкі | 62,6 |
| 14 | Дзераўноўскі | 43,9 |
| | Па раёну: | 76,7 |

## ЛІКВІДАВАЦЬ АДСТАВАННЕ

У соцыялістычным спаборніцтве па хлебапастаўках першае месца ў раёне ўвесь час занімае Акцябрскі сельсовет. Тут план збожжанарыхтовак дзяржаве выканан на 85,6 процантаў, у фонд Чырвонай Арміі—на 118 процантаў. За апошнія дні другое месца заняў Худлінскі сельсовет, Дзеткавіцкі перайшоў на трэцяе месца. Значна павысіў процант выканання збожжапаставак Першамайскі сельсовет.

Але па-ранейшаму працягвае адставаць Дзераўноўскі сельсовет (старшыня т. Грыб), Гарадзецкі (старшыня т. Карпічык).

З 7 па 12 кастрычніка з Дзераўноўскага сельсовета наступіла на прыёмачны пункт усяго 460 кілограм хлеба, з Гарадзецкага—1835 кг.

Такога становішча надалей цярпець нельга. Кіраўнікам гэтых сельсоветаў патрэбна накіраваць усе намаганні да таго, каб выйсці з прарыва і хутчэй завяршыць хлебапастаўкі дзяржаве.

Парада селяніну

## Пчоласем'ям — добрую зімоўку

Пчала—карысная насякомая. Пчаліны мёд з'яўляецца цэнным харчовым прадуктам, а воск прымяняецца як сыравіна ў многіх галінах прамысловасці. Акрамя гэтага пчолы ў значнай меры садзейнічаюць павышэнню ўраджайнасці насякомаапыляючых сельскагаспадарчых культур.

Нашы палі і лугі—гэта невычарпальныя багацці медоносных раслін. Усе ўмовы для развіцця пчалаводства ёсць. Трэба толькі мець кожнаму селяніну зацікаўленасць, праяўляць клопаты аб пчоласем'ях

Набліжаецца зіма. Кожны гаспадар, які мае пчолы, павінен загадзя для іх падрыхтаваць добрую зімоўку. Патрэбна праверыць, як праведзена ацяпленне вулляў, ці маецца ў дастатковай колькасці корму, а калі няма, то як і калі можна даць падкормку, ці ёсць адказная заслона пасекі ад вятроў і г. д.

Калі хто недастаткова разумее які трэба рабіць уход за пчоламі, ён павінен звярнуцца да больш вопытнага пчалавода. Стары пчалавод Нікіта Паўлавіч Кот з вёскі Коты, Дзеткавіцкага сельсовета, па просьбе сваіх аднавяскоўцаў дапамагае ім асабіста і сваімі парадамі як трэба ўхаджваць за пчоламі. Ён аказвае дапамогу і сялянам другіх вёсак.

Поўнае захаванне пчоласямей дасць магчымасць хутчэй развіць пчалаводства—карысную і цэнную галіну сельскай гаспадаркі.

**В. Барысюк,**
галоўны аграном райземаддзела.

## ВЫКАНАЛІ ПЛАН АЗІМАЙ СЯЎБЫ

Антопальскі, Галоўчыцкі, Аніскавіцкі, Дзераўноўскі сельсоветы на 10 кастрычніка выканалі план сяўбы азімых на 100 працантаў.

Сяляне гэтых сельсоветаў працягваюць сеяць звыш плана.

**Каночнык,**
заг. райземаддзела.



Днепрастрой. Алея з вуліц пасёлка Днепрастроя.
Фото Г. Седых. Фотахроніка ТАСС.

# НАФТАВЫЯ БАГАЦЦІ СОВЕЦКАГА САЮЗА

Наш век нярэдка называюць векам матораў. Але з роўным правам яго можна назваць і векам нафты. Зараз цяжка ўказаць якую-небудзь галіну народнай гаспадаркі, дзе нафтапрадукты не мелі-б важнейшага значэння. Аўтатранспарт і авіяцыя спажываюць бензін, сельская гаспадарка выкарыстоўвае для трактараў газу, параходы і цягнікі—мазут; любыя машыны маюць патрэбу ў змазачных маслах. У дарожным будаўніцтве шырока прымяняецца асфальт—акісленая форма нафты. З нафты-ж выдзяляюць толуол і бензол, якія ідуць на выпрацоўку выбуховых матэрый. Ужо ў першую сусветную вайну нафта зрабілася важнейшай стратэгічнай сыравінай. У другой сусветнай вайне значэнне нафтапрадуктаў вырасла ў многа разоў. Без нафты зусім не магчыма выкарыстанне новай ваеннай тэхнікі.

Совецкі Саюз па запасах нафты стаіць на першым месцы ў свеце. Па падліках акадэміка Губкіна сусветныя запасы нафты размяркоўваюцца наступным чынам (у млн. тон).

| | |
|---|---|
| СССР | 3877 |
| ЗША | 1765 |
| Ірак | 395 |
| Іран | 299 |
| Венецуэла | 235 |
| Гал. Індыя | 138 |
| Астатнія краіны | 368 |

У лік гэтых астатніх прыходзіцца на долю Румыніі 61 млн. тон, на долю Японіі—60, Францыі—1,3 і Германіі—1,2 млн. тон.

Дабыча нафты ў Расіі пачалася больш двух стагоддзяў таму назад на рацэ Ухце (Паўночны Край). Тут-жа ўпершыню з нафты сталі выпрацоўваць газу яшчэ задоўга да таго, як спосаб яе вытворчасці быў адкрыт амерыканскімі і нямецкімі вучонымі. З далучэннем да Расіі ў 1813 годзе Бакінскага ханства цэнтрам рускай нафтавай прамысловасці стаў Баку.

У першыя годы пасля кастрычніцкай рэвалюцыі совецкім нафтавікам прыходзілася не толькі аднаўляць складаную нафтавую гаспадарку, але і ўводзіць дакладную тэхніку ў бурэнне, дабычу і разведку. У выніку ўжо ў 1927 годзе дабыча па Совецкаму Саюзу дасягнула даваеннага ўзроўню і прадаўжала з год-ным годам расці. Адкрываліся і новыя раёны дабычы.

У 1928 годзе пачалася распрацоўка нафты ў паўночнай частцы Сахаліна. У 1929 годзе—на Урале ў Чусоўскіх Гарадках, у 1930 годзе былі адкрыты фантанныя пласты ў Туркменіі. Праз два годы совецкія разведчыкі перадалі ў эксплаатацыю Ішымбай—першае нафтавае месцараджэнне Башкірыі. У наступныя годы пачаў эксплаатавацца рад новых месцараджэнняў у Сярэдняй Азіі, у Грузіі і ўпершыню была знойдзена нафта на Украіне, каля горада Ромны. Разведчыкі паявіліся ў далёкай Арктыцы—на мысе Нордвік і ў Камчацкай тайзе. Вакол старых нафтавых плошчадак—Баку, Грознага, Майкопа таксама было адкрыта многа новых месцараджэнняў.

На 17 з'ездзе ВКП (б) таварыш Сталін паставіў як першачарговую задачу—ўзняцца за арганізацыю нафтавай базы ў раёнах заходніх і паўднёвых схілаў Уральскага хрыбта.

У выніку выканання ўказанняў таварыша Сталіна за годы пяцігодак паміж Волгай і Уралам вырасла і акрэпла новая нафтавая база Совецкага Саюза. Край, які здаўна спажываў нафту, стаў нафтадабываючым. Новая нафтавая база на ўсходзе—„Другое Баку" у дні Айчыннай вайны сыграла вялікую ролю ў забеспячэнні перамогі над гітлераўскімі захопнікамі. За час вайны таксама быў разведан і ўведзен у эксплаатацыю рад новых месцараджэнняў нафты.

У 1942 годзе пры пошукаразведвальных работах у ваколіцах Саратава быў знойдзен магутны газаносны раён. Ён ужо забяспечвае саратаўскую прамысловасць і насельніцтва горада танным, добрым палівам. Хутка саратаўскі газ будзе падавацца па газапроваду ў сталіцу нашай Радзімы—Маскву.

* * *

Нашы дасягненні вялікія. Але наперадзе прадстаіць яшчэ вялікая работа. Грамадныя тэрыторыі чакаюць разведчыкаў нафты. З іх дапамогай совецкія нафтавікі атрымаюць новыя перамогі.

**Праф. В. Батурын.**

В. а. рэдактара
П. СПІРЫДОНАЎ.